МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

# МАТЕРИАЛЫ
# МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ

**г. Барановичи**
**16–17 декабря 2003 года**

**В 2 частях**
**Часть 1**

**Барановичи**
**2003**

УДК 082 (043.2)
ББК 94
М 33

**Рецензенты:** доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки Республики Беларусь А.П. Сманцер; доктор психологических наук, доцент В.А. Янчук

**Редакционная коллегия:** Л.Ф. Мирзаянова (главный редактор), Е.И. Белая, И.В. Вакульчик, В.Н. Зуев, А.А. Ковалевская, Ю.В. Маслов, Е.И. Пономарева, Н.М. Сотник (1–3 направления), Е.Г. Карапетова, Ю.В. Маслов (4 направление), Е.И. Белая (5 направление), Е.Л. Малиновский, Е.И. Белая (6 направление)

**Материалы международной научно-практической**
М 33 **конференции молодых исследователей, Барановичи, 16–17 дек. 2003 г.: В 2 ч. Ч. 1 / Редкол.: Л.Ф. Мирзаянова (гл. ред.) и др.– Барановичи: БГВПК, 2003.– 562 с.**

ISBN 985-6616-08-5.
ISBN 985-6616-10-7 (Часть 1).

В сборнике содержатся статьи участников международной научно-практической конференции молодых исследователей.

Материалы теоретического и практико-ориентированного характера могут быть использованы преподавателями вузов, ссузов, учителями школ и студенческой молодежью, интересующейся научно-исследовательской деятельностью.

Министерство ... «Барановичский ... университет»

ЧИТАЛЬ... ЗАЛ

**УДК 082 (043.2)**
**ББК 94**

**ISBN 985-6616-08-5**
**ISBN 985-6616-10-7 (Часть 1)**

**© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2003**

выпрацаваны грамадскай свядомасцю, у т.л. такой яе формай, як мастацкая літаратура.

2. Праз спасціжэнне вобраза А. Загорскага ў студэнтаў фарміруецца пачуццё гонару за свой род, гісторыю, любоў да Радзімы, якое з'яўляюцца асновай перакананняў. Умелае кіраўніцтва аналітычнай дзейнасцю студэнтаў стымулюе роздум маладых людзей над праблемамі сучаснасці, сваім асабістым жыццём і гэтым самым фарміруе пачуццё адказнасці і абавязку перад народам, Бацькаўшчынай.

### Літаратура


1. Мальдзіс А. Жыццё і ўзнясенне У. Караткевіча.– Мн., 1990.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.– Мн., 2002.– Кн. 1.
3. Барадзіна А.І. Фарміраванне гістарычнай свядомасці школьнікаў пры вывучэнні рамана У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім".– Баранавічы, 1991.
4. Ішчанка Г.М. У. Караткевіч у школе: Дапам. для настаўніка.– Мн., 2002.


## ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ВЕРША МАКСІМА БАГДАНОВІЧА "СТРАЦІМ-ЛЕБЕДЗЬ"


**А.Л. Юдчыц**

Беларусь, г. Баранавічы

Баранавіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж

Навуковы кіраўнік – В.М. Шавель, старшы выкладчык


У гісторыі кожнага народа ёсць імёны, якімі ён асабліва ганарыцца. Але ёсць сярод іх і такія, якія сталі здабыткамі чалавецтва, бо слава іх перасягнула межы краін і часоў. Адным з такіх імёнаў з'яўляецца імя Максіма Багдановіча.

Адна з залацінак творчасці М. Багдановіча – "Страцім-лебедзь" – верш з глыбокім філасофскім зместам, рэквіем паэта свайму трагічнаму лёсу. Твор мае цікавую перадгісторыю.

Максім аднойчы падышоў да стомленага за дзень Змітрака Бядулі.

– Я тут чытаў, Змітрок, вашым сёстрам казкі. Ведаеце, я задумаў напісаць паэму на тэму біблейскага міфа. Гэту думку мне навеяла вайна, пагібель тысяч людзей і маё няшчаснае жыццё,– Максім задуменна паглядзеў у цёмнае начное акно.– А гэтая служба ўліку,

на якую мяне перавялі ў земстве, адбірае апошнія сілы: ад справаздач і слупкоў лічбаў у мяне галава кружыцца.

Сюжэт верша паэт узяў у "Беларускім зборніку" вядомага фалькларыста Раманава. Сярод твораў, якія складальнік назваў касмалагічнымі і культурнымі, ёсць зусім невялічкі твор "Страцім-птушка". Гэта маленькая, але цікавая і багатая па зместу казка звярнула на сябе ўвагу М. Багдановіча.

Біблейскае паданне расказвае аб сусветным патопе і асаблівай місіі Ноя, вялізны каўчэг якога адзін павінен ацалець сярод стыхіі. Па загаду Бога Ной павінен узяць у каўчэг па адной пары розных звяроў і птушак, каб не звёўся зусім іх род. "Ну, усе сабраліся, – апавядаецца ў казцы, – а лебедзь адзін – страцім зваўся па іменю – я, кажа, не пайду ў каўчэг, – я спраўлюся адзін з вадою, усю ваду абплыву! Багатыр сільны быў. Ну і паплыў. І плавае. Стала затопа. Некуды іншым птушкам падзецца. А Страцім плавае сабе. Вось тыя іншыя птушкі лятали-лятали, ды к яму, ды на яго панасядалі..."

Невядомы казачнік вядзе апавяданне ў спакойна-разважальным тоне, перадае дыялектныя асаблівасці мовы. У цэнтры ўвагі – падзея, канфлікт. Яны як бы знарок падкрэсліваюць аб'ектыўнасць і нават знешнюю абыякавасць да тых даўніх падзей. Зусім інакш падышоў да гэтай фабулы М. Багдановіч: творча апрацаваў яе, развіў сюжэтна, насыціў вялікай сілай і пачуццём, узняў да ўзроўню высокай паэзіі.

Гэты верш не прызначаны для беглага павярхоўнага прачытвання ў вольны час, яго сэнсам нельга прасякнуцца за адно-два прачытанні. Перачытваючы верш другі, трэці, чацвёрты раз, удумваешся, адкрываеш нанова глыбіню думкі, сэнс, што яго напаўняе.

Аналізуючы змест верша, адразу ж заўважаеш біблейскія матывы ў аповедзе – ідэя сусветнага патопу (сімвал лёсу, неабсяжнасці жыцця, забыцця...), місія Ноя па выратаванню і прадаўжэнню жыцця на зямлі. Біблейская легенда, апрацаваная з такім паэтычным майстэрствам, цікавіла Багдановіча не толькі сама па сабе. У ёй бачыў паэт і філасофію, і жыццёвую мудрасць. Мільёны людзей, якія гінулі на вайне, як бы прыпадабняюцца дужаму моцнаму птаху.

Біблейскі стыль апавядання верша задае яму ўрачысты, разважны тон, што мае на мэце ўдумлівае чытанне верша.

У вершы заключана багатая жыццёвая мудрасць, якая ўласціва сталаму чалавеку, закранута глыбокая філасофская думка аб самаахвяраванні ўласным лёсам дзеля жыццяў іншых людзей. Вобраз Лебедзя напаўняецца рэлігійным зместам, магчыма, прыпадабняецца яшчэ і вобразу Ісуса Хрыста, які выратаваў род людскі і ад яго ж пацярпеў здраду, здзекі і ганьбу ("птушкі ажна ўсцяшаюцца...").

Вобраз героя, трагічная пагібель яго за шчасце іншых – усё гэта ўспрымаецца і як рамантыка, і як жывая рэчаіснасць, кранаючы сэрцы чытачоў. Тым самым раскрываецца ўяўленне паэта пра сэнс жыцця. Годнае жыццё, на думку паэта, уключае духоўную напоўненасць, разнастайнасць, інтэнсіўнасць, ахвярнасць. Усё гэта будзе пераконваць чалавека ў тым, што жыццё пражыта нездарма. Багдановіч заклікае чалавека, каб ён дбаў пра тое, што пакіне пасля сябе, якім застанецца ў памяці людзей.

Верш чытаецца на адным дыханні, быццам роздум, роздум-боль, роздум-спачуванне...

Верш змякчае казачныя элементы, якія. прымаюць характэрныя адценні. Верш, як і казка, мае традыцыйны зачын: апісанне месца, дзе адбываюцца падзеі, характэрныя казачныя паўторы ("лясы – бары", "прасіць – маліць"). Пры дапамозе паўтору "Узмахне крылом – быццам бор шуміць, Узмахне другім – як мяцель гудзіць..." – можна правесці паралель з рускай казкай аб "царевне-лягушке" ("Взмахнёт рукавом – ..."). Характэрна паэтапнасць, чаргаванне падзей у часе ("Дзень ён плавае, другі, трэці дзень, на чацвёрты...").

Верш мае лагічную канцоўку: загінуў Страцім-лебедзь, і "ад усіх цяпер патомкі ёсць / Ды няма адных – Страцімавых (М. Багдановіч чытаў Зм. Бядулю "адных Максімавых"). У Бядулі аж дух перахапіла. Успомнілася, як некалькі дзён таму, калі яны сядзелі з Максімам на ганку, прыбег трохгадовы суседскі хлапчук. Максім пасадзіў яго да сябе на калені, пачаставаў цукеркамі, пагладзіў па галоўцы і сказаў, звяртаючыся да Бядулі: "Скажы, Самуіл Яфімавіч, чаму я не маю права мець сына, я ж так люблю дзяцей?.." І гучыць, быццам зварот да чытача, нават да свайго лёсу, горкае пытанне: "Чаму так? За што?" – і няма адказу. Нідзе ў паэзіі Максіма Багдановіча не знойдзеш нават і следу якой-небудзь скаргі на лёс, а між тым лёс паэта – трагічны.

Найбольш актыўна ствараюць вобраз, дапамагаюць дасягнуць гармоніі паміж словам і вобразам сродкі марфалагічнага ўзроўню ў творы.

У першай страфе наяўнасць шматлікіх дзейсловаў ("учнуць", "пацякла", "разлілася", "затапіла", "уздымаюцца") дапамагае перадаць неагляднасць воднай гладзі, прасторавую шырыню, якую нельга ахапіць вокам. Гукавыя паўторы па якасці, алітэрацыя гукаў [з], [ч], [ш] дапаўняюць вобразны малюнак хваль, шум, журчанне, хлюпанне вады; ужыванне парных назоўнікаў ("лугі – лагі", "лясы – бары") – неабсяжнасць прастору перад вачыма. Гукапіс [о], [а] задае запаволены тэмп, які потым нарастае, інтанацыя набывае трывожнасць,

напружанасць, стварае драматычны характар гучання ў фінале твора, узмацняе эмацыянальны настрой, уплыў на чытача.

Для верша характэрна адметная ўнутраная структура, дакладная сінтаксічная арганізацыя – наяўнасць і перавага бяззлучнікавых сказаў, аднародных выказнікаў ("лётаюць", "енчаць", "крычаць", "выглядаюць"). Сярод графічных сродкаў, знакаў прыпынку звяртаюць на сябе працяжнікі – у 3-й, 4-й страфе – гэта сродак узмацнення раней прачытанай фразы ("Узмахне крылом – быццам бор шуміць..."), ("Страцім-лебедзь – горды, моцны птах..." – працяжнік выражае захапленне, зачараванасць, гонар). І працяжнік у апошняй страфе "Ды няма адных – Страцімавых" прадугледжвае лагічную паўзу, завершанасць верша, але незавершанасць роздуму над сваім лёсам... Большасць слоў у вершы ўжыты ў прамым значэнні, словы з пераносным значэннем набываюць гіпербалізаваны характар ("Уздымаюцца вышэй да гор", "як мяцель гудзіць", "енчаць жаласна, ад нуды крычаць").

Шырока выкарыстаны аўтарам фальклорныя вобразы, выяўленчыя сродкі і прыёмы: гіпербалізаваныя параўнанні ("Узмахне крылом – быццам бор шуміць", "Узмахне другім – як мяцель гудзіць"), разнастайныя паэтычныя паўторы ("Дайце вы грудзям, гэй, вальней уздыхнуць! Дайце вы крылам, гэй, шырэй узмахнуць!"), эпітэты ("белы – вольны свет", "мора сінята"), падваенне слоў ("лугі-лагі", "лясы-бары", "прасіць-маліць").

Прааналізаваўшы колькасць часцін мовы ў вершы, заўважаем, што пераважаюць дзеясловы, якія надаюць дынамізм апісанню падзей, экспрэсіўнасць, уздым пачуццяў, дапамагаюць перадаць змену душэўнага стану. Паэт актыўна выкарыстоўвае граматычныя сродкі мовы: формы абвеснага ладу дзеясловаў (пацякла, енчаць, плавае...), загаднага ладу (дайце, узляціце), паўторы ("горды, моцны птах", "дайце вы грудзям...", "усе лугі-лагі"), выклічнікі, звароткі ("гэй, вы").

У вершы назіраецца інверсія (парушэнне прамога парадку слоў) – "дужы, смелы плавае", "птахі дробныя". Гэта з'ява акцэнтуе ўвагу на якасці пэўнага слова, лагічна вылучае яго, з'яўляецца дадатковым сродкам эмацыянальнага ўздзеяння на чытача. Твор дае багаты матэрыял для правядзення паўзроўневага, суцэльнага і свабоднага аналізу.

Мэтанакіраванае чытанне верша дапамагае заўважыць тое, што раней не прымушала задумацца, не кранала. Няма сумнення, што да вершаў трэба звяртацца зноў і зноў, перачытваючы, уяўляючы, удумваючыся, адкрываючы нанова глыбіню думкі, разгадваючы таямніцы мастацкага слова.

**Літаратура**


1. Барсток М.М. Максім Багдановіч у школе.– Мн., 1991.
2. Бачыла А. Дарогамі Максіма Багдановіча.– Мн., 1993.
3. Зубараў Л. Максім Багдановіч.– Мн., 1989.
4. Кабаковіч А.К. Паэзія Максіма Багдановіча.– Мн., 1978.


# ВОБРАЗ РАГНЕДЫ ЯК ВЫМЯРАЛЬНЫ ІНСТРУМЕНТ САМАСВЯДОМАСЦІ
## (на прыкладзе мастацкага твора)


**Т.Я. Яцэнка**
Беларусь, г. Баранавічы
Баранавіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж

Навуковы кіраўнік – Я.Л. Маліноўскі, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт


Сучаснае эканамічнае, палітычнае і культурнае жыццё настойліва патрабуе асэнсавання таго, як у самасвядомасці сучаснага беларуса адлюстраваны асноўныя праявы гэтых жыццёвых сфер. Мы можам вылучыць падабенства рысаў псіхалагічнага сённяшняга і мінулага жыцця. Акцэнтацыя на самасвядомасці беларусаў мінулага часу дазваляе выявіць элементы падабенства самасвядомасці іх і нашых сучаснікаў, сведчаннем чаго з'яўляецца вобраз Рагнеды. Ён дазваляе дэкадыфіцыраваць інфармацыю, якая можа сёння ўспрымацца як паказальная ў вызначэнні напрамкаў развіцця самасвядомасці беларусаў. Гэтая акалічнасць дае падставу меркаваць аб актуальнасці псіхалагічнай сувязі з мінулым, магчымасць выявіць асноўныя элементы ідэнтычнасці і схільнасцяў да нацыянальнага менталітэту.

Такая актуальнасць вызначае мэту даследавання ў дасягненні спосабу псіхалагічнага выйсця беларуса са стагнацыйных умоў развіцця самасвядомасці ў накірунку асэнсавання лагічна-гістарычнага шляху свайго народа. Суадносіны мастацкага вобраза, што адлюстроўвае гэты шлях, з фенаменалагічнымі дыспазіцыямі нашага сучасніка служаць рашэнню пошукавых задач удасканалення яго ўласнай асобы.

Поле суадносін інтэлектуальнага і мастацкага, генетычнага і рэлігійнага ў сацыяльным індывідзе ўтварае аб'ект вывучэння самасвядомасці беларуса. Яго ўдасканаленне шляхам усталявання сувязі паміж вызначальным вобразам і лагічным дыскурсам складае фенаменалагічны прадмет даследавання.